Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (100), 2017

*УДК 323.31 (476) (091)*

# Грамадзянская супольнасць: гісторыка-тэарэтычныя асновы

М.В. Прахарэня

Даследуецца праблема эвалюцыі ўяўленняў аб грамадзянскай супольнасці ў гісторыі сусветнай сацыяльна-філасофскай думкі. Выяўляюцца асаблівасці станаўлення і генезісу канцэпцыі грамадзянскай супольнасці. Пералічваюцца дасягненні ў тэорыі грамадзянскай супольнасці. Адлюстроўваюцца асноўныя пункты гледжання буйнейшых прадстаўнікоў сусветнай грамадскай думкі на працэс узаемадзення грамадзянскай супольнасці і дзяржавы. Вызначаецца роля грамадзянскай супольнасці ў забеспячэнні сацыяльнай стабільнасці і ўстойлівага развіцця грамадства.

**Ключавыя словы:** грамадзянская супольнасць; тэорыя грамадзянскай супольнасці; дзяржава; дэмакратыя; тэорыя грамадскай дамовы; грамадства.

The evolution of public perceptions of civil society in the world history of socio-philosophical thought is considered. Peculiarities of formation and genesis of the civil society concept are revealed. Achievements in the civil society theory are specified. The world major public opinions on the interaction process between civil society and state are identified. The role of the civil society in ensuring stability and sustainable development of society is defined.

**Keywords:** civil society; theory of civil society; state; democracy; theory of the social contract; society.

Грамадзянская супольнасць – неабходны сегмент дэмакратычнай прававой дзяржавы, а яе фарміраванне – прыярытэтная задача развіцця многіх краін свету. Будаўніцтва грамадзянскай супольнасці – неад’емны накірунак палітыкі Рэспублікі Беларусь – замацаваны ў нарматыўна-прававых актах нашай дзяржавы. Так, згодна з Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі, будаўніцтва грамадзянскай супольнасці з’яўляецца адной са стратэгічных задач палітычнай сферы разам з устойлівым развіццём дэмакратычнай, прававой, сацыяльна-адказнай дзяржавы [1]. Сталая грамадзянская супольнасць, улічваючы нацыянальныя асаблівасці, будзе садзейнічаць развіццю эканомікі, фарміраванню моцнай дзяржавы і дэмакратычных інстытутаў, забеспячэнню нацыянальнай згоды і сацыяльнай стабільнасці, што, у сваю чаргу, дапаможа выпрацаваць унікальную і дзейсную беларускую мадэль устойлівага развіцця. Зварот да генезісу канцэпцыі грамадзянскай супольнасці спрыяе паглыбленню ўяўленняў пра гэты феномен, асэнсаванню сацыяльных і палітычных задач, якія ў сучасны момант стаяць перад нашай дзяржавай.

Першыя тэарэтычныя распрацоўкі канцэпцыі грамадзянскай супольнасці з’явіліся яшчэ ў антычнай філасофіі, калі мысліцелі толькі асэнсоўвалі праблемы арганізацыі жыцця грамадства ў сістэме дзяржавы. Менавіта ў гэту эпоху і адбывалася зараджэнне асноў грамадзянскай супольнасці. Ужо ў VII–VI стст. да н.э. у выніку дэмакратычных пераўтварэнняў у Старажытнай Грэцыі чалавек заканадаўча надзяляўся правамі, атрымліваў статус грамадзяніна і мог удзельнічаць у палітычным жыцці дзяржавы-поліса.

У філасофіі антычнасці паняцці «грамадства», «грамадзянская супольнасць» і «дзяржава» атаясамліваліся. Так, Платон у дыялогу «Дзяржава» прадставіў мадэль ідэальнай дзяржавы і прынцыпы гарманічнага ўладкавання грамадства. На яго думку, соцыум будуецца на аснове патрэб чалавека ў ежы, жыллі, адзенні і г. д. Галоўнай умовай узнікнення ідэальнай дзяржавы, паводле Платона, з’яўляецца справядлівасць. Яна ў тым, каб кожны грамадзянін ці саслоўе мелі асаблівае становішча і занятак. Платон прапанаваў падзяліць соцыум на тры катэгорыі: кіраўнікі-філосафы, вартаўнікі-воіны і вытворцы, да якіх належылі рамеснікі і земляробы. Менавіта ў падзеле працы і заключаўся асноўны прынцып пабудовы грамадства. Платон выступаў за роўнасць паміж людзьмі: кожны займаецца тым, што адпавядае яго разумовым якасцям [2]. Такім чынам, з пункту гледжання развіцця тэорыі грамадзянскай супольнасці, заслугай Платона з’яўляецца распрацоўка канцэпцыі аб месце і ролі грамадзян і іх саслоўяў у грамадстве і дзяржаве.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ідэі аб сутнасці грамадзянскай супольнасці займалі адно з цэнтральных месцаў у дзейнасці Арыстоцеля, які вызначыў палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя перадумовы для яе з’яўлення. Так узнікла паняцце «politiki koinonia» – палітычная супольнасць з ліку незалежных і роўных мужоў грэчаскага поліса. Пазней гэты тэрмін пераклалі на лацінскую мову – «societas civitas», што азначае «грамадзянская супольнасць». Арыстоцель вызначыў сутнасць самога паняцця «грамадзянін» – той, хто прымае ўдзел у заканадаўчай і судовай уладзе. Асаблівая ўвага надавалася сярэдняму класу, які павінен служыць апорай дзяржавы. Вылучаліся тры катэгорыі грамадства (вельмі багатых, бедных і тых, хто знаходзіцца пасярэдзіне). Сярэдні клас, поводле Арыстоцеля, не імкнецца да чужога дабра, а найлепшае для дзяржавы – каб яе грамадзяне валодалі сярэдняй уласнасцю. Дарэчы, філосаф быў прыхільнікам прыватнай уласнасці. Ён пісаў: «Уласнасць павінна быць агульнай толькі ў адносным сэнсе, а наогул – прыватнай ... лепш, каб ўласнасць была прыватнай, а карыстанне ёю – агульным» [1] [3, с. 410]. Многія з гэтых ідэй з’яўляюцца актуальнымі і сёння. Менавіта сярэдні клас і прыватную ўласнасць сучасныя даследчыкі вылучаюць як аснову для фарміравання грамадзянскай супольнасці. Устойлівая пазіцыя гэтай катэгорыі насельніцтва выступае фундаментам грамадства, спрыяе ўмацаванню даверу і сацыяльнай салідарнасці.

Наступным крокам у асэнсаванні сутнасці феномену грамадзянскай супольнасці сталі меркаванні Цыцэрона – вядомага палітыка і мысліцеля Старажытнага Рыму. Як і папярэднікі, ён не праводзіў мяжы паміж паняццямі «грамадства» і «дзяржава». Вялікім дасягненнем старажытнай філасофіі стала абгрунтаванне неабходнасці роўнасці ў грамадстве. Так, паводле Цыцэрона, людзей павінен злучаць закон, а права, якое ўстаноўлена законам, павінна быць аднолькавым для ўсіх. Пазіцыя філосафа па пытанні роўнасці паміж людзьмі адлюстроўвалася ў поглядах на праблему справядлівасці і аптымальнага ўладкавання грамадства: да ўсіх грамадзян патрэбна адносіцца аднолькава справядліва – не адымаць маёмасць у адных і аддаваць іншым ці дараваць запазычанасці. Так, паводле Цыцэрона, роўныя правы для ўсіх грамадзян – гарантыя стабільнасці [4].

Першыя паўнавартасныя суб’екты грамадзянскай супольнасці – органы самакіравання, гільдыі купцоў, аб’яднанні рамеснікаў – заявілі аб сабе ў эпоху Сярэднявечча. Аднак у гэты перыяд, які характарызуецца дамінаваннем дзяржаўнай улады над грамадствам, паняцце «грамадзянская супольнасць» не ўжывалася. Тым не менш, народжаныя ў антычнасці ідэі атрымалі далейшае развіццё ў працах сярэднявечных мысліцелей.

Так, італьянскі філосаф і палітык М. Макіявелі выказаў думку аб імкненні дзяржавы абяссіліць і падарваць ўсялякую дзейнасць грамадства для таго, каб узвысіцца самой. Дзяржаву ён разглядаў як вышэйшую праяву чалавечага духу, а сэнс існаванння чалавека бачыў у служэнні ёй. Так, грамадзяне павінны бесперашкодна займацца гандлем, земляробствам і рамёствамі, каб забяспечыць свой дабрабыт, не баяцца высокіх падаткаў і канфіскацыі маёнткаў. Тым не менш, правы дзяржавы ў адносінах да грамадства абмяжоўваліся. Макіявелі сцвярджаў, што дзяржава не павінна « …замахвацца на маёмасныя правы падданых» [5, с. 82].

Наступным этапам у распрацоўцы канцэпцыі тэорыі грамадзянскай супольнасці сталі працы XVII ст. У гэты перыяд у Еўропе пачынаецца крызіс феадальных адносін, утвараецца новы клас грамадства – буржуазія, які імкнуўся змяніць грамадскі лад. Адбыліся буржуазныя рэвалюцыі, мэтай якіх стала абмежаванне абсалютнай улады манарха. Першымі такімі дзяржавамі сталі Англія і Галандыя. Там і з’явілася тэорыя аб грамадскай дамове і грамадзянскай супольнасці. У пазначаны перыяд канцэпцыя грамадзянскай супольнасці фарміравалася ў форме вучэнняў аб грамадскім жыцці, а яе змест быў звязаны з пераходам соцыуму і чалавека ад непалітычнага дадзяржаўнага стану да палітычнага і дзяржаўнага, ад хаосу і ўзаемнай барацьбы – да парадку і грамадзянскіх адносін.

Пачынаючы з XVII ст. тэрмін «грамадзянская супольнасць» пачаў актыўна выкарыстоўвацца. Прадстаўнікі грамадскай думкі ўжо не атаясамлівалі яго з паняццем дзяржавы ці дзяржаўным кіраваннем, як гэта рабілі філосафы Антычнасці і Сярэднявечча, але і не праводзілі прынцыповага адрознення.

---

1 Тут і далей пераклад наш. – *М.П.*

Вядомы прадстаўнік тэорыі натуральнага права і дамоўнага паходжання дзяржавы Т. Гобс сцвярджаў, што, дзякуючы грамадскай дамове, людзі змаглі стварыць спецыяльны інстытут – дзяржаву – для таго, каб абмежаваць «натуральныя правы» законамі і спыніць «вайну ўсіх супраць усіх», хаос і насілле. Прычына аб’яднання – «страх перад злом, якое яны могуць зрабіць адзін аднаму» [6, с. 282]. Паводле Гобса, пад патранажам дзяржаўнай улады чалавек змяняецца і становіцца паўнавартасным членам грамадзянскай супольнасці [6].

Думку Т. Гобса адносна ўтварэння дзяржавы працягнуў галандскі філосаф Б. Спіноза, які адзначаў, што дзяржаўная ўлада падпарадкоўвае чалавека аднолькавым законам і рэгулюе грамадскае жыццё. Гісторыю чалавецтва ён падзяліў на два этапы: натуральны і дзяржаўны, ці грамадзянскі. Апошні і ёсць грамадзянская супольнасць, якая «ўсталёўваецца натуральна для ліквідацыі агульнага страху і для таго, каб пазбегнуць агульных бед» [7, с. 553].

Заснавальнік лібералізму Дж. Лок тлумачыў «натуральны стан» людзей не як «вайну ўсіх супраць усіх», а як стан свабоды і роўнасці. Калі Гобс супрацьпастаўляў яго грамадзянскаму, то Лок лічыў, што грамадзянская супольнасць вырастае менавіта з натуральнага стану і з’яўляецца яго лагічным працягам: «…калі якая-небудзь колькасць людзей так аб'яднана ў адно грамадства, што кожны адмаўляецца ад сваёй выканаўчай улады, уласцівай яму па закону прыроды, і перадае яе грамадству, то тады, і толькі тады, існуе палітычная ці грамадзянская супольнасць» [8, с. 312].

Мысліцелі і філосафы XVIII ст. працягвалі развіваць тэорыю грамадзянскай супольнасці ў напрамку даследавання яе сутнасці і ролі ў функцыянаванні дзяржавы як інстытута, які забяспечвае сацыяльную роўнасць і грамадзянскія свабоды, становіцца асноўным пры распрацоўцы ідэй будучага ўладкавання грамадства.

Французскі філосаф Ш.Л. Мантэск’е не праводзіў прынцыповых адрозненняў паміж грамадзянскай супольнасцю і дзяржавай. На яго думку, гэтыя катэгорыі ўзаемаабумоўлены. Мантэск’е трактаваў грамадзянскую супольнасць як больш высокую ступень развіцця чалавецтва: гэта грамадства барацьбы, якое ператвараецца ў дзяржаву, каб нейтралізаваць гэтае супрацьстаянне. Як і Макіявелі, Мантэск’е вылучаў сферы, якія не могуць быць падкантрольнымі дзяржаве. Адносіны ў грамадстве павінны рэгулявацца палітычнымі і грамадзянскімі законамі. Першыя рэгламентуюць адносіны паміж правіцелямі і народам, другія працуюць для грамадства і вызначаюць адносіны ўсіх грамадзян паміж сабой (правілы заключэння шлюбу, размеркавання маёмасці і прыватнай уласнасці) [9].

Прыхільнік поглядаў Мантэск’е, шатландскі філосаф А. Фергюсон, стаў аўтарам першага спецыяльнага даследавання па тэорыі грамадзянскай супольнасці. Дадзенае паняцце разглядалася ім як спецыфічны і незалежны ад дзяржавы інстытут. У трактаце «Вопыт гісторыі грамадзянскай супольнасці» быў зроблены акцэнт на сацыяльным характары прыроды чалавека: «людзей трэба разглядаць у супольнасцях – так, як яны заўсёды жылі» [10, с. 34].

Французскі філосаф Ж.Ж. Русо ўмовай існавання грамадзянскай супольнасці лічыў грамадскую дамову, асноўнай задачай якой было «знайсці такую форму асацыяцыі, якая бараніла і ахоўвала б усёй агульнай сілай асобу і маёмасць кожнага члена і дзякуючы якой кожны разам з усімі падпарадкаваўся б толькі самому сабе і заставаўся такім жа вольным, як і раней». Грамадзянская супольнасць, якую Русо называў асацыяцыяй, магла існаваць толькі тады, калі кожны чалавек аддаваў «сваю асобу і ўсю сваю моц пад вярхоўнае кіраўніцтва агульнай волі, пры гэтым выступаючы часткай цэлага» [11, с. 207].

Уяўленні аб грамадзянскай супольнасці пазней пашырыў І. Кант, які сцвярджаў, што гэты працэс заканамерны ў сваім гістарычным развіцці. На яго думку, яе фарміраванне адбываецца шляхам злучэння і ўзгаднення натуральнай свабоды людзей: найвялікшая праблема для чалавечага рода, вырашыць якую прымушае прырода, – дасягненне ўсеагульнай прававой грамадзянскай супольнасці» [12, с. 12].

Да XIX ст. практычна ніводны прадстаўнік філасофскай думкі не размяжоўваў паняцці «дзяржава» і «грамадзянская супольнасць». Было агульнапрынята меркаванне, што існаванне першай катэгорыі – дзяржавы – прадугледжвае існаванне другой – грамадзянскай супольнасці. Адным з першых, хто паспрабаваў дыферэнцыяваць гэтыя катэгорыі, быў нямецкі вучоны

РЕПОЗИТОРИЙ

В. фон Гумбальдт. Размежаваннямі катэгорый «дзяржава» і «грамадзянская супольнасць» выступілі адрозненні паміж: сістэмай нацыянальных устаноў (арганізацый, саюзаў, якія фарміруюцца «знізу» самімі індывідамі) і сістэмай дзяржаўных інстытутаў; «натуральнам і агульным праве», якое дае дзяржава; «чалавекам» і «грамадзянінам». Гэтыя адрозненні, на думку вучонага, не дазваляюць атаясамліваць «дзяржаву» і «грамадзянскую супольнасць». Ён пісаў: «…дзяржаўны лад не самамэта, а толькі сродак для развіцця чалавека, … катэгорыя «грамадзянская супольнасць» больш значная, чым катэгорыя «дзяржавы», дзейнасць якой павінна быць падначалена задавальненню патрэб і інтарэсаў чалавека» [13, с. 189].

Ф. Гегель выступіў з прынцыпова новымі палажэннямі. Многія даследчыкі называюць яго «ўзорным тэарэтыкам грамадзянскай супольнасці». У трактаце «Філасофія права» ён дакладна размежаваў паняцці «дзяржава» і «грамадзянская супольнасць». Апошнюю, на думку філосафа, неабходна разглядаць як стадыю ці этап ў дыялектычным развіцці ад сям'і да дзяржавы. Аднак мысліцель адзначаў, што грамадзянская супольнасць абавязкова прадугледжвае існаванне дзяржавы. Ён сцвярджаў, што фундаментам грамадзянскай супольнасці з'яўляецца прыватная ўласнасць, агульнасць інтарэсаў і роўнасць грамадзян, якая гарантавана законам [14]. Менавіта Гегелю належыць выключная роля ў распрацоўцы дадзенай канцэпцыі. Пазнейшыя даследаванні грунтаваліся на гегелеўскай характарыстыцы самастойнасці грамадзянскай супольнасці ў адносінах да дзяржавы.

У рамках сваіх канцэптуальных падыходаў феномен грамадзянскай супольнасці вывучалі ідэолагі марксізму – К. Маркс, Ф. Энгельс, А. Грамшы. Яны разглядалі фарміраванне грамадзянскай супольнасці ў якасці неабходнай умовы для паспяховага будаўніцтва новага грамадскага ладу. Так, К. Маркс вызначаў грамадзянскую супольнасць як вынік і пэўную ступень у гістарычным развіцці. На адрозненне ад Ф. Гегеля ён сцвярджаў, што дадзеная катэгорыя выступае перадумовай узнікнення дзяржавы. Акрамя таго, ім было адзначана, што, дзяржава – гэта палітычная ўстанова, форма, якая арганізуе грамадзянскую супольнасць. У сваю чаргу, Ф. Энгельс у артыкуле «Карл Маркс» адзначаў: «…грамадзянская супольнасць з'яўляецца той сферай, у якой трэба шукаць ключ да разумення працэсу гістарычнага развіцця чалавецтва» [15, с. 379].

Больш глыбока праблемы дэмакратызацыі грамадства сталі асэнсоўваць у XX ст. Канцэпцыя грамадзянскай супольнасці змянялася і ўдакладнялася, распрацоўваліся новыя падыходы. Калі раней увага даследчыкаў была засяроджана на патрабаваннях эканамічнай і палітычнай свабоды для асобы, то ў XX ст. – на пашырэнні свабод у духоўнай сферы і культуры, у ладзе жыцця і інш. У гэты перыяд актуалізаваліся не толькі праблемы ўзаемаадносін дзяржавы і грамадства, але і пытанні найлепшага сацыяльнага ўладкавання.

Так, англійскі палітолаг Дж. Кін звярнуў увагу на пытанне суадносін ступені свабоды і падначалення чалавека грамадству [16]. Аўстрыйскі і брытанскі сацыёлаг К. Попер выступіў з канцэпцыяй сацыяльнай інжынерыі і адкрытага грамадства, асноўнымі каштоўнасцямі якога з'яўляюцца індывідуалізм, свабода кожнай асобы, дэмакратыя і рацыянальнае кіраўніцтва дзяржавай. Паўнавартаснае функцыянаванне гэтых катэгорый павінна забяспечыць грамадзянская супольнасць. Умяшальніцтва дзяржавы ў гэты працэс «павінна быць абмежавана ў той ступені, якая па-сапраўднаму неабходна для абароны свабоды» [17, с. 153]. Вядомы сацыёлаг А. Сейлс адзначаў, што грамадзянская супольнасць развіваецца толькі ў сістэме, дзе прызнаецца свабода меркаванняў і асацыяцый. Яна выступае крыніцай легітымнасці ўлады, якая заключаецца ў плюралізме думак і спаборніцтве палітычных партый. Дзяржава, выкарыстоўваючы сілавыя ці заканадаўчыя структуры, не павінна перашкаджаць гэтаму працэсу [18].

Паступова грамадзянская супольнасць стала разглядацца як складаная сацыяльная з'ява. На думку даследчыкаў XX ст., яна стане тым звяном, якое павінна злучыць асобу і дзяржаву, прыватную і публічную сферы. Сучасная тэорыя грамадзянскай супольнасці як складанай і незалежнай ад грамадства сістэмы прадстаўлена ў сацыяльна-палітычных і філасофскіх працах Ю. Хабермаса, П. Бергера, Т. Парсанса, Дж. Ролза, Э. Фрома, Г. Маркузе, М. Аўкшота, М. Фуко, Э. Арато, В. Гавела і інш. Такім чынам, працэс даследавання станаўлення і

асаблівасцей развіцця грамадзянскай супольнасці працягваецца. Гэты феномен апісваюць у сваіх працах гісторыкі, сацыёлагі, палітолагі, журналісты. Сёння не існуе адзінага меркавання адносна сутнасці гэтага паняцця. Вялікая колькасць падыходаў да яго разумення не дазваляе знайсці агульнага азначэння. У цэлым сутнасць гэтых падыходаў заключаецца ў тым, што грамадзянская супольнасць прадстаўляе сабой сістэму самастойных і незалежных ад дзяржавы інтытутаў, якія знаходзяцца з ёй у раўнапраўных і канструктыўных узаемаадносінах для таго, каб забяспечыць умовы для рэалізацыі і абароны інтарэсаў грамадзян.

Генезіс ідэі грамадзянскай супольнасці паказвае, што яе асноўныя канцэптуальныя палажэнні заўсёды былі і будуць накіраваны ў бок агульначалавечых каштоўнасцей – адстойвання натуральнага права чалавека на жыццё і свабодную дзейнасць, прызнання роўнасці грамадзян перад законам, абгрунтавання прынцыпу падзелу ўлады ў межах фарміравання прававой дзяржавы і г. д. Гэтыя палажэнні, у сваю чаргу, спрыяюць дэмакратычнаму ладу, ствараюць спрыяльныя ўмовы для жыцця і працы, забяспечваюць сацыяльную стабільнасць і нацыянальную згоду ў грамадстве.

**Літаратура**

1. Концепция национальной безопасности Республики Беларусь [Электронный ресурс]: утв. Указом Президента Республики Беларусь, 9 ноября 2010 г., № 575 // Комитет государственной безопасности Республики Беларусь. – Режим доступа : http://kgb.by/ru/ukaz575. – Дата доступа : 14.03.2016.

2. Платон. Сочинения : в 3-х т. / Платон. – М. : Мысль, 1971. – Т. 3., ч. 1. – 687 с.

3. Аристотель. Сочинения : в 4-х т. / Аристотель. – М. : Мысль, 1983. – Т. 4. – 830 с.

4. Цицерон, М.Т. Диалоги / М.Т. Цицерон. – М. : Наука, 1996. – 224 с.

5. Маккиавелли, Н. Государь; Рассуждения о первой декаде Тита Ливия; О военном искусстве: сборник / Н. Маккиавелли. – Мн. : ООО «Попурри», 1998. – 672 с.

6. Гоббс, Т. Сочинения : в 2-х т. / Т. Гоббс. – М. : Мысль, 1989. – Т. 1. – 622 с.

7. Спиноза, Б. Избранные произведения : в 2 т. / Б. Спиноза – М. : Политиздат, 1957. – Т. 1. – 627 с.

8. Локк, Дж. Сочинения : в 3-х т. / Дж. Локк. – М. : Мысль, 1985. – Т. 3. – 1988. – 668 с.

9. Монтескье, Ш.Л. О духе законов / Ш.Л. Монтескье. – М. : Мысль, 1999. – 672 с.

10. Фергюсон, А. Опыт истории гражданского общества / А. Фергюсон. – М. : РОССПЭН, 2000. – 392 с.

11. Руссо, Ж.Ж. Об общественном договоре: Трактаты / Ж.Ж. Руссо. – М. : Терра – Книжный клуб, 2000. – 544 с.

12. Кант, И. Сочинения : в 6-ти т. / И. Кант. – М. : Мысль, 1964. – Т. 6. – 799 с.

13. История политических и правовых учений XVII–XVIII вв. / Н.М. Азаркин [и др. ]. – М. : Наука, 1989. – 446 с.

14. Гегель, Г. Философия права / Г. Гегель. – М. : Мысль, 1990. – 524 с.

15. Маркс, К. Сочинения / К. Маркс, Ф. Энгельс. – изд. 2-е. – М. : Государственное издательство политической литературы, 1960. – 839 с.

16. Кин, Дж. Демократия в гражданском обществе: О трудностях европейского социализма, перспективах демократии и проблеме контроля над социально-политической властью / Дж. Кин ; пер с англ. Л. Макеева, И. Мюрберг. – М. : Прогресс-Традиция, 2001. – 400 с.

17. Поппер, К.Р. Открытое общество и его враги : в 2-х т. / К.Р. Поппер. – М. : Феникс, 1992. – Т. 2 : Время лжепророков: Гегель, Маркс и другие оракулы. – 528 с.

18. Sales, A. The Private, the Public and Civil Society: Social Realms and Power Structures / A. Sales // International Political Science Review. – 1991. – Vol. 12, № 4. – P. 295–312.

Белорусский государственный университет Поступила в редакцию 04.06.2016

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ